***Таблица 3.*** Расходы по содержанию братского склада в 1886–1896 гг.

| | Годы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1886 | 1887 | 1888 | 1889 | 1890 | 1891 |
| Приобретение топлива (в руб.) | - | 7,80 | 18,50 | 5,40 | 13 | 15,29 |
| Жалованье продавцу (в руб.) | 48,0 | 60,0 | 60,0 | 31,05 | 38,69 | 24,87 |
| | Годы | | | | | |
| | 1892 | 1893 | 1894 | 1895 | 1896 | 1897 |
| Приобретение топлива (в руб.) | 16,75 | 17,40 | 16,30 | 23,12 | | - |
| Жалованье продавцу (в руб.) | 21,59 | 0 | 0 | 0 | | - |

**СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ**


1. Отчет Могилевского Богоявленского братства за 1886 год (читанный в общем собрании братства 18 января 1887 года) // Могилевские епархиальные ведомости. – 1887. – № 3–4 (часть официальный). – С. 74–84.
2. Каталог книг и других предметов, продающихся в складе Могилевского Богоявленского братства, в г. Могилеве, в доме Воскресенской церкви // Могилевские епархиальные ведомости. – 1890. – № 33 (часть официальная). – С. 349–354.
3. Каталог книг и других предметов, продающихся в складе Могилевского Богоявленского братства в г. Могилеве, в доме Воскресенской церкви // Могилевские епархиальные ведомости. – 1891. – № 7 (часть официальная). – С. 82–86.
4. Отчет Могилевского Богоявленского братства за 1887 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1888. – № 6–7 (часть официальная). – С. 107–116.
5. Отчет Могилевского Богоявленского православного братства за 1888 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1889. – № 5–6 (часть официальная). – С. 96–105.
6. Отчет о деятельности Могилевского Богоявленского братства за 1889 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1890. – № 3–4 (часть официальная). – С. 6–33, № 5 (часть официальная). – С. 37–52.
7. Отчет Могилевского православного Богоявленского братства за 1890 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1891. – № 4–5 (часть официальная). – С. 18–60.
8. Отчет Могилевского Богоявленского православного братства за 1891 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1892. – № 6–7 (часть официальная). – С. 33–70.
9. Отчет Могилевского Богоявленского православного братства за 1892 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1893. – № 10–11 (часть официальная). – С. 48–72.
10. Отчет Могилевского Богоявленского православного братства за 1894 год // Могилевские епархиальные ведомости. – 1895. – № 11–12 (часть официальная). – С. 39–60.
11. Отчет о состоянии и деятельности Могилевского церковно-православного Богоявленского братства за 1895–96 годы // Могилевские епархиальные ведомости. – 1897. – № 4–5 (часть официальная). – С. 28–54.
12. Отчет Могилевского Богоявленского православного братства за 1893 // Могилевские епархиальные ведомости. – 1894. – № 12–13 (часть официальная). – С. 56–80.


*Материал поступил в редакцию 25.04.12*

**VOSOVICH S.M. Sale of spiritually-moral literature and articles of religious character by Mogilevskim Bogoyavlenskim fraternity in 1889–1896**

In the article the author analyzes the sale of spiritual and moral literature and objects of ecclesiastical character Mogilev Bogoyavlensky Brotherhood in 1886–1896. It is concluded that this type of activity has strengthened the Orthodox faith in the population of Mogilev diocese.

УДК 947,6 (“1921-1939”)

***Гарматны В.П.***

# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ПРАВЯДЗЕННЯ КАМАСАЦЫІ НА ЗЕМЛЯХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 ГГ.

**Уводзіны.** Камасацыя (хутарызацыя) – гэта адна са складовых частак аграрнай рэформы польскіх улад, якая ажыццяўлялася ў 1921–1939 гг. на землях Польшчы, і перш за ўсё Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія раней знаходзіліся ў складзе Расійскай Імперыі, з мэтаю ліквідацыі цераспалосіцы і інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

Пад назваю “Заходняя Беларусь” у артыкуле разглядаецца тая тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, якая ў 1921–1939 гг. уваходзіла ў склад ІІ Рэчы Паспалітай: сучасныя Брэсцкая і Гродзенская цалкам і часткова Мінская і Віцебская вобласці (у азначаны перыяд – Навагрудскае ваяводства, Палескае ваяводства без Камень-Кашырскага, Сарненскага і часткі Пінскага і Столінскага паветаў, Гродзенскі, Ваўкавыскі і часткова Аўгустоўскі і Сакольскі паветы Беластоцкага ваяводства, Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Дзісненскі, Маладзечанскі, Пастаўскі і часткова Свянцянскі паветы Віленскага ваяводства), агульнай плошчаю каля 82 000 кв. км [7, с. 17–19].

Неабходна адзначыць, што ў 1921–1939 гг. у польскай статыстыцы падлік вёўся галоўным чынам па ваяводствах і Заходняя Беларусь не вылучалася як асобны рэгіён, а асноўную частку заходнебеларускіх зямель разам з Валынскім ваяводствам складалі ўсходнія ваяводствы ІІ Рэчы Паспалітай, у той час як Гродзенскі і Ваўкавыскі паветы ўваходзілі ў склад Беластоцкага і адносіліся да цэнтральных ваяводстваў. У адпаведнасці з агульнапрынятымі ў гістарыяграфіі правіламі, за статыстычныя звесткі па Заходняй Беларусі прымаюцца дадзеныя па Віленскаму, Навагрудскаму і Палескаму ваяводствах у цэлым, калі лічыць умоўна, што Камень-Кашырскі і Віленска-Трокскі паветы па сваіх паказчыках прыкладна адпавядаюць Ваўкавыскаму і Гродзенскаму [8, с. 12, 101].

Паводле звестак сельскагаспадарчага перапісу, праведзенага польскімі ўладамі 30 верасня 1921 г., у Заходняй Беларусі налічвалася 349 239 самастойных сялянскіх гаспадарак з зямельнымі надзеламі да 50 га, агульная плошча якіх складала 2 392 388 га [2, с. 28]. Каля 207 900 гаспадарак заходнебеларускіх сялян былі цераспалоснымі і вузкапалоснымі: з іх сяляне, якія мелі ад 1 да 2 га зямлі, складалі 14,8%, ад 2 да 5 га – 44,2%, ад 5 да 10 га – 29,5%, ад 10 да 20 га – 9,6%, ад 20 да 50 (заможныя сяляне) – 1,9%. Такім чынам, 59% цераспалосных гаспадарак прыходзілася на малазямельныя з надзелам да 5 га, і толькі 1,9% складалі гаспадаркі заможных сялян з надзеламі ад 20 да 50 га. Каля 40% сялянскіх

***Гарматны Віталь Пятровіч,*** *магістр гістарычных навук, аспірант 3 года навучання кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт”.*



Репозиторий БрГТУ

гаспадарак усходніх ваяводстваў мелі некаторыя зямельныя надзелы шырынёю ад 1 да 2 метраў, а 14% гаспадарак нават з шырынёю менш за 1 метр, праз што на такіх надзелах селяніну з канём было цяжка нават развярнуцца [3, с. 34].

Тагачасныя польскія эканамісты і навукоўцы падкрэслівалі, што падобная сітуацыя ў землекарыстанні назіралася раней і ў Заходняй Еўропе, але там аб'яднанне сялянскіх зямельных надзелаў адбылося нашмат раней, у той час як у ІІ Рэчы Паспалітай камасацыю яшчэ толькі трэба было паўсюдна правесці [9, s. 134–135]. Як адзначаў тэарэтык польскай аграрнай навукі прафесар Францішак Буяк, "правядзенне камасацыі ёсць непазбежная ўмова ўздыму прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі і навогул усяго аграрнага прагрэсу. Камасацыя павінна ісці адначасова з рассяленнем вёскі (на хутары)" [10, s. 152].

Першыя падрыхтоўчыя мерапрыемствы па камасацыі былі праведзены польскімі ўладамі на заходнебеларускіх землях яшчэ ў 1919 г. падчас Савецка-польскай (1919–1921 гг.) вайны, мэтанакіравана яна стала праводзіцца з 1921 г., а 31 ліпеня 1923 г. Сеймам ІІ Рэчы Паспалітай быў прыняты закон аб камасацыі (ссяленні, scalenia), які стаў галоўнай пастановаю, што вызначала яе ажыццяўленне [21]. У залежнасці ад існуючай у дзяржаве эканамічнай сітуацыі і тэмпаў рэалізацыі палітыкі ссялення правядзенне камасацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. можна падзяліць на тры асноўныя перыяды: 1) 1921–1928 гг.; 2) 1929–1933 гг.; 3) 1934–1939 гг.

За 1921–1928 гг. польскімі ўладамі былі праведзены значныя падрыхтоўчыя работы па ажыццяўленні камасацыі, распрацавана яе заканадаўчая база і створаны кантралюючыя органы (павятовыя і ваяводскія зямельныя ўправы, міністэрствы сельскай гаспадаркі, сельскагаспадарчых рэформ і іншыя). Больш хуткае правядзенне камасацыі ў Заходняй Беларусі распачалося з 1927 г., пасля прыходу да ўлады маршала Юзэфа Пілсудскага, які бачыў у заможных сялянах сацыяльнае апірышча польскіх улад [5, с. 27], і пасля выхаду ў свет сумеснага распараджэння міністэрстваў фінансаў і сельскагаспадарчых рэформ ІІ Рэчы Паспалітай ад 14 студзеня 1927 г. аб выдачы сялянам, што пераходзяць на хутар, ільготных банкаўскіх крэдытаў пад 4% гадавых [19], выдадзенае па ініцыятыве міністра сельскагаспадарчых рэформ Вітольда Станевіча [13, s. 134]. Неабходна падкрэсліць, што за адзін толькі 1927 г. на хутары выйшла каля 12% заходнебеларускіх сялян, што было ў 3 разы больш, чым за папярэднія гады разам узятыя [8, с. 100].

У сваёй прамове ў Сейме ад 9 лютага 1927 г. В. Станевіч адзначыў, што без правядзення камасацыі немагчыма існаванне дробных сялянскіх гаспадарак, якія могуць пастаўляць дзяржаве прадукты, без ажыццяўлення ссялення немажліва складванне ўнутранага рынку і развіццё гарадоў, разам з тым, "пры камасацыі кожны ўладальнік гаспадаркі атрымлівае значную карысць, мае пэўныя цяжкасці і церпіць страты. Баланс страт і набыткаў для яго павінен быць станоўчым, тады ён прыхільнік камасацыі. Калі ж гэты баланс адмоўны, дык селянін становіцца заўзятым яе ворагам. Неабходна падкрэсліць, што для дробных гаспадарак цяжкасці і розныя страты, звязаныя з камасацыяй, пераўзыходзяць выцякаючыя з яе набыткі. Аднак калі атрымаюць яны магчымасць павелічэння сваіх гаспадарак, дык адразу выгоды камасацыі становіцца для іх відавочнымі і адразу адбываецца змена настрою" [16, s. 126–127]. Разам з тым, фінансавыя магчымасці дзяржавы і сялянства былі даволі абмежаванымі, што не спрыяла камасацыі.

Як адзначалася ў плане работ Палескай акруговай зямельнай управы за 1927–1928 гг. і аналізе існуючых у ваяводстве аграрных адносін, "камасацыю трэба паставіць на першае месца (з усіх складовых частак аграрнай рэформы), бо камасацыя ўпарадкоўвае недахопы існуючых аграрных адносін, у сувязі з чым, пры (далейшым) правядзенні перабудовы зямельнага ўпарадкавання гэтаму раздзелу працы павінна быць нададзена найбольшая ўвага" [1, арк. 1].

Праводзіць камасацыю польскім уладам першапачаткова было досыць цяжка праз адсутнасць дакладнай праграмы аграрных пераўтварэнняў і наяўнасці свабодных фінансаў, акрамя таго, сяляне на пачатку не мелі дакладнага ўяўлення пра сутнасць і мэты камасацыі, у сувязі з чым не бачылі сэнсу ў пераходзе на хутары. Многія сялянскія гаспадаркі патрабавалі неадкладнага надзялення дадатковаю зямлёю, але польскія ўлады не мелі магчымасці гэта ажыццявіць.

Аб ажыццяўленні польскімі ўладамі камасацыі на землях Заходняй Беларусі па стане на 1929 г. сведчыць наступная табліца [17, s. 40]:

| Ваяводства | Колькасць гаспадарак | Плошча, га |
|---|---|---|
| Віленскае | 15 454 | 173 127 |
| Навагрудскае і беларускія паветы Беластоцкага | 11 847 | 108 405 |
| Палескае | 9 661 | 108 707 |
| **Разам** | **36 962** | **390 239** |

Значнымі перашкодамі на шляху правядзення камасацыі сталі цяжкае матэрыяльнае становішча заходнебеларускага сялянства, мясцовыя прыродныя ўмовы (забагненасць і неабходнасць ажыццяўлення пры камасацыі ў больш чым палове выпадкаў мерапрыемстваў па меліярацыі), адсутнасць дастатковай колькасці кваліфікаваных землямераў, актыўная падрыўная дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і іншых левaрадыкальных арганізацый і г.д.

У 1929–1933 гг., у вельмі складаных умовах сусветнага эканамічнага крызісу, магчымасці польскага ўраду па выдачы заходнебеларускім сялянам крэдытаў на перасяленне і перанясенне будынкаў былі істотна абмежаваны, і таму аплочваць ажыццяўленне работ па камасацыі хутаране павінны былі перш за ўсё за свой уласны кошт. Як пісаў у 1929 г. прафесар Францішак Буяк, "аграрная рэформа ў Польшчы не ёсць такая лёгкая ці простая справа, як тое здавалася б таму, хто бачыць справу толькі са сваіх ваколіц і думае толькі пра інтарэсы малазямельных сялян ці беззямельных батракоў вясковых" (гэта значыць камуністаў) [11, s. 86].

Неабходна адзначыць, што ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызіса правядзенне камасацыі заняла ў планах польскага ўраду асаблівае месца, выйшла на першае месца, стала яе "вокам у галаве" [12, s. 140]. Польскія ўлады бачылі ў камасацыі, дзякуючы канцэнтрацыі ворнай зямлі пры ажыццяўленні хутарызацыі, сродак супрацьвагі сусветнаму эканамічнаму крызісу, у сувязі з гэтым правядзенне камасацыі ў азначаны перыяд значна паскорылася: на працягу 1919–1929 гг. камасацыя ахапіла 36 962 сялянскія гаспадаркі агульнаю плошчаю ў 390 239 га, а за 1930–1936 гг. – 153 838 у 1 138 061 га. Калі на пачатку 1920-х гг. звычайна штогод было камасавана 3 360 гаспадарак плошчаю 35 476 га і на кожную з іх у сярэднім прыходзілася 10,5 га, то потым – 21 977 гаспадарак з 162 580 га, прыкладна 7,3 га на гаспадарку [6, с. 39–40]. Пра рэалізацыю камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1929-1933 гг. сведчыць наступная табліца [15, s. 210–211]:

| Ваяводства | Колькасць гаспадарак | Плошча, га |
|---|---|---|
| Віленскае | 19 897 | 180 369 |
| Навагрудскае і беларускія паветы Беластоцкага | 40 287 | 299 167 |
| Палескае | 20 075 | 220 110 |
| **Разам** | **80 259** | **699 646** |

Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў, на 1934 г. пры захаванні тэмпаў апошніх пяці гадоў (1929–1934) для поўнага правядзення камасацыі і ліквідацыі цераспалосіцы ў сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі неабходна было яшчэ як мінімум 14 гадоў (да 1948 г.) [17, s. 448–449]. На думку задзейнічаных ссяленні спецыялістаў для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі неабходнай нарматыўна-прававой і тэхнічнай дакументацыі па ссяленні і, пры магчымасці, па надзяленні дадатковаю зямлёю мясцовых беззямельных і малазямельных сялян, а таксама тых, якія пераносілі асабістыя гаспадарчыя будынкі.



Репозиторий БрГТУ

Міністр сельскай гаспадаркі Юліуш Панятоўскі ў студзені 1935 г. абгрунтоўваў зацягванне ажыццяўлення камасацыі наступнымі прычынамі: недастатковай падрыхтоўкай землямерных прац перад іх ажыццяўленнем на грунце; неналежнай кваліфікацыяй выканаўцаў работ па ссяленні; недаацэнкаю ўдзельнікамі ссялення гаспадарчага боку і неўдакладненнем яго з хутаранамі; невыкананнем з боку павятовых старостваў усіх неабходных землямерных работ; незадавальняючаю арганізацыяй нагляду за правядзеннем работ пассяленні.

Міністр адзначаў, што распачынанне на грунце землямерных работ без удакладнення існуючых на месцы аграрных адносін (цераспалосіцы, замены надзелаў, ліквідацыі сервітутаў, меліярацыі і г.д.) зацягвала ссяленне, у выніку чаго страты нясуць як дзяржава, так і сяляне. Акрамя таго, многія землямеры з мэтаю зарабіць як мага больш грошай набралі заказаў на ажыццяўленне камасацыі ў некалькіх аддаленых мясцовасцях, а асноўныя работы па складанні і ажыццяўленні камасацыйных праектаў перакладалі на памочнікаў, што яшчэ больш павялічвала тэрміны ссялення.

У 1934–1939 гг. эканамічная сітуацыя ў II Рэчы Паспалітай часткова палепшылася, акрамя таго, выраслі кошты на сельскагаспадарчыя тавары, што садзейнічала паляпшэнню дабрабыту заходнебеларускага сялянства і прыспешванню камасацыі. Пра рэалізацыю польскімі ўладамі камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1934–1939 гг. сведчыць наступная табліца [14, s. 70]:

| Ваяводства | Колькасць гаспадарак | Плошча, га |
|---|---|---|
| Віленскае | 39 864 | 262 010,4 |
| Навагрудскае і беларускія паветы Беластоцкага | 60 248 | 295 975,7 |
| Палескае | 42 072 | 280 981,9 |
| **Разам** | **142 084** | **838 967** |

Пры правядзенні камасацыі за кошт скарачэння колькасці межавых палосак агульная плошча сялянскіх надзелаў узрастала ад 3% да 9%, акрамя таго, дзякуючы ўдасканаленню існуючых у аграрнай сферы юрыдычных адносін, кошт камасаванай зямлі ўзрастаў прыкладна на 30% [18, s. 11–12].

За 1921–1939 гг. польскімі ўладамі было камасавана каля 43% сялянскіх гаспадарак і 45% зямлі [4, с. 20]. У цэлым, аб ажыццяўленні польскімі ўладамі камасацыі на землях Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. сведчыць наступная табліца [14, s. 70]:

| Ваяводства | Колькасць вёсак | Колькасць гаспадарак | Плошча, га |
|---|---|---|---|
| Віленскае | 2 544 | 75 115 | 615 506,4 |
| Навагрудскае і беларускія паветы Беластоцкага | 1 341 | 112 372 | 703 547,7 |
| Палескае | 499 | 71 818 | 609 798,9 |
| **Разам** | **4 384** | **259 305** | **1 928 853** |

**Заключэнне.** Такім чынам, галоўнай мэтаю камасацыі ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд было стварэнне заможных рынкава арыентаваных сялянскіх хутарскіх гаспадарак фермерскага тыпу, здольных не толькі забяспечваць сябе самастойна, але і пастаўляць прадукты на рынак.

Правядзенне камасацыі было перарвана ў верасні 1939 г. пачаткам Другой сусветнай вайны, і таму яна не змагла выканаць пастаўленыя задачы і вырашыць аграрнага пытання цалкам, але паслабіла сацыяльную напружанасць у заходнебеларускай вёсцы, садзейнічала паляпшэнню дабрабыту мясцовага сялянства, памяншэнню колькасці працадзён, неабходных для апрацоўкі асабістага надзелу, павышэнню культуры апрацоўкі зямлі і, адпаведна, паказчыкаў ураджайнасці і агульнага збору сельскагаспадарчых культур, а таксама складванню агульнага ўнутранага рынка і станаўленню ў аграрнай сферы Заходняй Беларусі капіталістычных адносін.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1439. План работы Полесского окружного земельного управления на 1927-1928 г. и сведения об аграрном положении Полесья
2. Зялінскі, П.І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919–1939) / П.І. Зялінскі // Праблемы ўз`яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17–18 верасня 1999 года, Мінск, БДУ. – Мінск, БДУ, 2000. – С. 24–30.
3. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939) / Б.Е. Кухарев. – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.
4. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939) / В.А. Полуян. – Минск: Наука и техника, 1978. – 360 с.
5. Полуян, В.А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В.А. Полуян, И.В. Полуян. – Минск: Государственное издательство БССР, 1962. – 224 с.
6. Полуян, И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг. / И.В. Полуян – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.
7. Савіч, А. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва (гістарыяграфічныя нататкі) / У. Міхнюк, А. Савіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 11. – С. 14–21.
8. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.
9. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodległosci i Drugiej Wojny Światowej (1918–1945) / Cz. Brzoza. – Kraków: Fogra, 2001. – 424 s.
10. Bujak, F. O naprawie ustroju rolnego w Polsce / F. Bujak. – Warszawa-Lublin-Łódż-Kraków: G. Gebetner i Spółka, [б. г.]. – 160 s.
11. Bujak, F. O podziale ziemi i reformie rolnej / F. Bujak. – Warszawa: Biuro Propagandy Wewnętrznej, 1920. – 104 s.
12. Historia chlopów polskich: w 3 tomach. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej / pod redakcją Stefana Inglota. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – T. 3. – 715 s.
13. Łapa, M. Problemy przebydowy structuralnej rolnictwa polskiego w latach 1926-1930. Program agrarny Witolda Staniewicza / M. Łapa // Acta Universitatis Lodziensis. Folia Historica 66. Historia Polski XIX-XX wieku, pod redakcja Pawla Samusia. – Łódż: Wydawnictwo Uniwersytetu Łódzkiego, 1999. –S. 119–140.
14. Maly rocznik statystyczny. – Warszawa, Glowny Urząd Statystyczny, 1939. – 425 s.
15. Materialy statystyczne // Rolnictwo. – 15 maja 1934 r. – S. 202–211.
16. Mowa p. Witolda Staniewicza, ministra reform rolnych, wygloszona na 321-em posiedzeniu Sejmu (dn. 9 lutego 1927 r.) // Dziennik urzędowy Ministerstwa Reform Rolnych. – 1927. – № 5. – S. 146–161.
17. Odlanicki-Poczobutt, St. Województwo Nowogródzkie / St. Odlanicki-Poczobutt. – Wilno: Nakladem Wileńskiej Izby Rolniczej, 1936. – 498 s.
18. Rolnictwo w Polsce. Jaki jest stan rolnictwa i co rząd robi dla jego podniesenia. – Warszawa, Wydawnictwo Bezpartyjnego Bloku Wspolpracy z Rządem, 1930. – 32 s.
19. Rozporządzenie z dnia 14 stycznia 1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów // Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). – 1927. – № 6. – Poz. 36. – S. 45–47.
20. Staniewicz, W. Matujzy Bolondziszki: wieś powiaty Lidzkiego / W. Staniewicz. – Wilno, Gebethner i Wolff, 1923. – 160 s.
21. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050–1056.


*Материал поступил в редакцию 16.03.12*

Репозиторий БрГТУ

**HARMATNY V.P. Periodization of the comasation on the lands of Western Belarus in 1921–1939**

The article tells about the periodization of comasation in Western Belarus in 1921–1939. The author shows suffering of local peasantry and necessity of the agrarian reform which was realized by Polish government in 1921–1939. Realization of comasation was accompanied by distribution of credits. Thanks to comasation in Western Belarus the quantity of working days necessary for peasants for the cultivation their lands decreased, quality of cultivation agriculture lands was improved and accordingly its crop capacity increased. In accordance with socio-economic circumstances and the pace of comasation its realization by Polish authorities on the territory of Western Belarus it is necessary to divide into three main periods: 1) 1921–1928; 2) 1929–1933; 3) 1934–1939.

УДК 341.322.6(476)(=432.1) «192»

***Грыбава С.У.***

# БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ГАДЫ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭПРЭСІЙ 30-Х ГАДОЎ XX СТ. У БССР

Таталітарны сталінскі рэжым 30-х гадоў закрануў людзей з розных бакоў: перахлёсты ў рэлігійнай і нацыянальнай палітыцы, індустрыялізацыі і насаджэнні калгасаў, чысткі ў арміі і дзяржапараце. Пацярпела ад сталінскіх рэпрэсій у гэты перыяд і татарскае насельніцтва Беларусі.

Рэлігійная палітыка савецкай улады была накіравана супраць існавання розных канфесій, у тым ліку і мусульманскай. Антырэлігійная прапаганда на «сталінскай мове» азначала знішчэнне мячэцей і мулаў. У 1936 г. мячэць у Мінску была зачынена і перададзена пад склад харчовых тавараў. Годам раней былі знішчаны мячэці ў Смілавічах і Капылі, спалена мячэць ва Уздзе. Быў «раскулачаны» і высланы на поўнач са сваёй шматлікай сям'ёй і загінуў у выгнанні апошні мула Уздзенскай мячэці Мухамед Александровіч (у 1930 г.), расстраляны ў Чэрвеньскай турме мула Смілавіцкай мячэці Мустафа Хасяневіч, мязім (ці муэдзін, памочнік мулы) Адам Хасяневіч і былы мула гэтай мячэці Асан Паўтаржыцкі (у 1937 г.). Неабгрунтаваныя рэпрэсіі былі значнай часткай тагачаснай палітычнай дзейнасці партыйна-дзяржаўных органаў Беларусі. Яны былі накіраваны не толькі супраць рэлігійных дзеячаў.

Згодна з дакладам намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходняму краю І. Апанскага, ва ўмовах НЭПа ўзрастала актыўнасць нацыянальнай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў нацыянальных груп, дзейнасць якіх негатыўна ўспрымалася ўладамі [1, с. 83]. Так, падчас фарсіраваных сацыяльных пераўтварэнняў у 30-я гг. шырока праводзілася барацьба супраць так званага нацыянальнага адзінства, якая закранула разам з іншымі нацыянальнасцямі і татараў. Дарэчы, першым прадстаўніком цюркска-мусульманскіх народаў, абвінавачаным у нацыяналізме, панцюркізме і панісламізме, быў вядомы татарскі дзеяч Султан-Галіеў. Яму таксама прыпісвалася стварэнне і кіраўніцтва падпольнай антысавецкай арганізацыяй у рэгіёне Ідэль-Урала. «Справа Султан-Галіева» была сфабрыкавана органамі ДПУ ў 1923 г.

Закранулі пазначаныя працэсы і беларускіх татараў. У Мінску ў сакавіку 1933 г. органамі АДПУ была арыштавана група татарскіх і беларускіх інтэлігентаў, якія абвінавачваліся па сумнавядомым артыкулам 72 і 76 Крымінальнага кодэксу БССР (антысавецкая агітацыя і прапаганда, удзел у контррэвалюцыйных органах). У сфабрыкаваным абвінаваўчым заключэнні па справе І.К. Гембіцкага., І.Х. Мурза-Мурзіча, І.Х. Рызвановіча і І.Х. Дашкевіча гаварылася, што *«у сакавіку 1933 г. была ліквідавана контррэвалюцыйная нацыяналістычная татарская групоўка, якой кіраваў былы падпалкоўнік царской арміі Гембіцкі Іван Канстанцінавіч* (Ях'я Хасенавіч Гембіцкі – вядомы грамадскі дзеяч, гісторык, які шмат намаганняў паклаў дзеля нацыянальна-культурнага развіцця татарскай меншасці ў міжваенны перыяд – *С.Г.*). *У склад групоўкі ўваходзілі Мурза-Мурзіч Ібрагім Халільевіч, Рызвановіч Хасень Іосіфавіч, Дашкевіч Іосіф Сямёнавіч, Даўгяла Дзмітрый Іванавіч, Мухля Ібрагім Александравіч. Контррэвалюцыйная татарская групоўка развівала арганізацыйную дзейнасць па стварэнню контррэвалюцыйнай арганізацыі за кошт татарского рэлігійнага насельнщтва, варожа настроенага супраць Савецкай улады, распаўсюджваючы свой уплыў і на працоўных татараў для стварэння контр-рэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі, якая ставіла сваёй мэтай звяржэнне Савецкай улады і ўстанаўленне рэспубліканска-дэмакратычнага ладу»* [2, с. 214]. І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі асуджаны на тры гады высылкі ў Казахстан. Па просьбе Беларускага грамадскага аб'яднання татараў «Зікр уль-Кітаб» кіраўніцтва Дзяржкамархіва Беларусі звярталася ў сакавіку 1998 г. у Інфармацыйны цэнтр Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Казахстан з запытам аб прадстаўленні звестак на Я. Гембіцкага, І. Мурза-Мурзіча і Х. Рызвановіча. 28 красавіка 1998 г. Упраўленне крымінальнай інфармацыі выслала даведку на Ях'ю Гембіцкага, з якой відаць, што пасля высылкі ў Казахстан ён працаваў эканамістам у абласным упраўленні калгасаў г. Уральска. 14 ліпеня 1938 г. Я. Гембіцкі быў паўторна арыштаваны і знаходзіўся ва Уральскай турме. На І. Мурза-Мурзіча і Х. Рызвановіча звестак няма. Там жа, у Казахстане, яны былі паўторна асуджаны да вышэйшай меры пакарання. 10 кастрычніка 1989 г. рашэннем Пракуратуры БССР І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі рэабілітаваны пасмяротна [2, с. 230].

У 1937–1938 гг. па загаду з Масквы праводзілася аперацыя па ліквідацыі польскай, нямецкай і латвійскай агентуры. Цэнтр лічыў, што БССР з'яўлялася плацдармам для пранікнення варожай, асабліва польскай «агентуры» ў іншыя рэгіёны СССР. У жніўні 1938 г. паводле загаду М.І. Яжова падлягалі арышту не менш як 7–8 тысяч польскіх «шпіёнаў» – былых удзельнікаў польскіх узброеных фарміраванняў, палітэмігрантаў, членаў нелегальнай «Польскай арганізацыі вайсковай» (ПАВ) і інш. У выніку здзейсненай працы з дакументамі ў архіве КДБ вядомы даследчык гісторыі татарскай меншасці Беларусі І.Б. Канапацкі прыводзіць наступныя дадзеныя аб рэпрэсаваных з ліку татарскага насельніцтва БССР. Адразу па трох артыкулах: 68, 71, 76 Крымінальнага кодэксу БССР (шпіянаж, дыверсія, удзел у контррэвалюцыйных арганізацыях) было прад'яўлена абвінавачванне бухгалтару арцелі Белпрамсавета Байрашэўскаму Аляксандру Мустафавічу, 1890 года нараджэння, служачаму, выхадцу з дваран, былому члену КП(б)Б, які пражываў у г. Мінску. Ён быў расстраляны 26 снежня 1937 г. Брат А.М. Байрашэўскага Ібрагім Мустафавіч Байрашэўскі таксама быў арыштаваны НКУС 22 жніўня 1937 г. У ходзе следства Ібрагім Байрашэўскі спачатку абвінавачваўся ў шпіянажы, а затым, калі шпіянаж не пацвердзіўся, – у антысавецкай агітацыі. Вінаватым сябе ў прад'яўленых яму абвінавачваннях Ібрагім Байрашэўскі не прызнаў. Тым не менш, пастановай НКУС СССР і Пракуратурай СССР ад 28 верасня 1937 г. ён быў асуджаны на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр 16 красавіка 1943 г. ва Ухціжэмлагу (Комі АССР). У 1956 г. у выніку дадатковага расследавання было высветлена, што звестак аб прыналежнасці братоў Байрашэўскіх да агентуры польскіх

***Грибова Светлана Владимировна**, ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*



Репозиторий БрГТУ